5. Як вы думаеце, чаму «рэлігійныя забабоны» разглядаліся кіраўніцтвам СССР як істотная перашкода на шляху да сацыялізму і камунізму?

# § 23. Беларуская нацыя ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь

§ 23-1

§ 23-2

1. Назавіце вядомыя вам гістарычныя і нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці.
2. Калі быў абвешчаны дзяржаўны суверэнітэт БССР?

**Развіццё сучаснай беларускай нацыі.** Стварэнне 1 студзеня 1919 г. Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі адыграла лёсавызначальную ролю ў практычнай рэалізацыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Менавіта БССР выканала ролю цэнтра дзяржаўнага, палітычнага, эканамічнага і культурнага аб’яднання беларускай нацыі.

У БССР упершыню былі створаны эфектыўна дзеючы апарат дзяржаўнага кіравання, нацыянальная сістэма адукацыі і культуры, магутны эканамічны патэнцыял. Іншымі словамі, была закладзена аснова для ўзнікнення незалежнай і суверэннай дзяржавы — сучаснай Рэспублікі Беларусь.

На думку некаторых сучасных беларускіх гісторыкаў, працэс фарміравання беларускай нацыі завяршыўся ў 20-я гг. XX ст.

*Выкарыстоўваючы веды аб прыкметах нацыі, выкажыце свой пункт гледжання па гэтым пытанні.*

Такім чынам, на працягу XX ст. **беларуская нацыянальная ідэя** атрымала рэальнае ўвасабленне: беларускі народ завяршыў кансалідацыю ў адзіную нацыю, здабыў уласную дзяржаву. БНР дэкларавала, але не забяспечыла дзяржаўнасць беларусаў. Утварэнне БССР, абвяшчэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь сталі этапамі на шляху станаўлення беларускай дзяржаўнасці. БССР рэалізавала дзяржаўнасць у рамках федэратыўнай дзяржавы — СССР. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь стала ўвасабленнем сапраўднай, рэалізаванай у поўным аб’ёме ў агульнапрызнаных міжнароднай супольнасцю рамках беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сучасная беларуская нацыя функцыянуе ў новых гістарычных умовах. Галоўным зместам дадзенага этапу развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці з'яўляецца фарміраванне эфектыўнай, дэмакратычнай прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці, развіццё грамадскага самакіравання, забеспячэнне міжнацыянальнага, міжканфесійнага міру і згоды.

**Нацыянальны састаў насельніцтва Беларусі.** У сілу гістарычнага мінулага ў нашай краіне на працягу многіх пакаленняў мірна суіснуюць прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Па дадзеных перапісу насельніцтва 2019 г. на тэрыторыі Беларусі пражывалі прадстаўнікі больш як 130 народаў і народнасцей. Сярод іх беларусы (7 990 719, або 84,9 %), рускія (706 992, або 7,5 %), палякі (287 693, або 3,1 %), украінцы (159 656, або 1,7 %), яўрэі (13 705), армяне (9392), татары (8445), цыганы (6848), азербайджанцы (6001), літоўцы (5287), туркмены (5231). У Рэспубліцы Беларусь таксама пражывае ад 1 да 3,5 тыс. малдаван, немцаў, грузінаў, кітайцаў, узбекаў, латышоў, казахаў, арабаў і таджыкаў.



Нацыянальны састаў насельніцтва Беларусі

*Абмяркуйце, з якімі грамадска-палітычнымі падзеямі маглі быць звязаны міграцыйныя працэсы ў пачатку 1990-х гг.*

На нацыянальны састаў насельніцтва Беларусі вялікі ўплыў аказалі міграцыйныя працэсы ў пачатку 1990-х гг. Удзельная вага прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей у Беларусі мянялася ў залежнасці ад розных фактараў, звязаных з войнамі, дзяржаўнай палітыкай, міграцыяй і інш.

**Характарыстыкі сучаснага менталітэту беларусаў.** Традыцыйнымі рысамі менталітэту беларускага народа з'яўляюцца патрыятызм, мужнасць, гуманнасць, добразычлівае стаўленне да іншых народаў.

Для сучаснага беларускага менталітэту характэрная адсутнасць пачуцця перавагі над іншымі народамі. Само жыццё навучыла беларусаў думаць пра інтарэсы грамадства ў цэлым, а не толькі пра свае ўласныя. Цярплівасць, цягавітасць і неагрэсіўнасць, свабодалюбства, адвага і рашучасць беларусаў звязаны з гістарычным мінулым нашага народа, насычаным войнамі і ваеннымі канфліктамі. Лепшыя якасці беларускага народа ярка праявіліся ў гады Вялікай Ай-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Абмяркуйце, ці можна сцвярджаць, што рысы менталітэту беларускага народа гістарычна абумоўленыя.*

чыннай вайны — на франтах, у масавым партызанскім і падпольным руху на тэрыторыі Беларусі.

Важнае значэнне маюць паважлівае стаўленне беларусаў да іншых поглядаў, пазіцый, узораў культуры, імкненне да ўзаемапаважлівага суіснавання з прадстаўнікамі іншых нацый, канфесій, сацыяльных груп і г. д.



Беларускі нацыянальны строй

Беларускі нацыянальны характар таксама ўключае такія рысы, як сталасць, устойлівасць, пазбяганне крайнасцей у праяўленні сваіх пачуццяў і эмоцый. Распаўсюджванне хрысціянства на нашых землях прыўнесла ў менталітэт жыхароў Беларусі новыя рысы. Хрысціянская вера паступова фарміравала ў беларусаў гуманнасць у адносінах адзін да аднаго. Яшчэ адной рысай псіхалогіі беларусаў можа лічыцца іх адносная кансерватыўнасць, якая выяўляецца ў нежаданні хуткіх і радыкальных пераўтварэнняў, змен, у схільнасці жыць па традыцыі.

**Ідэалогія беларускай дзяржавы.** Кожны народ у ходзе свайго гістарычнага развіцця выпрацоўвае пэўную сістэму ўяўленняў, паняццяў, прынцыпаў фарміравання сваёй нацыянальнай супольнасці, форм свайго дзяржаўнага і эканамічнага жыцця, сваіх узаемаадносін з іншымі народамі. Гэтыя ідэі і ўяўленні заўсёды складалі і будуць складаць аснову пабудовы народам сваёй дзяржавы.

Сістэму выпрацаваных народам ідэй і ўяўленняў аб гісторыі станаўлення і развіцця сваёй дзяржаўнасці, асаблівасцях уладкавання інстытутаў дзяржаўнай улады, аб кірунках, мэтах і задачах далейшага развіцця дзяржавы, формах і спосабах яго ўзаемадзеяння з іншымі народамі з поўнай упэўненасцю можна назваць ідэалогіяй нацыянальнай дзяржаўнасці, якая акумулюе ўсё канструктыўнае, карыснае для Беларусі з вопыту мінулага і дасягненняў сучаснасці.

Характэрнымі рысамі ідэалогіі з’яўляюцца патрыятызм, адданасць Айчыне, гонар за свой народ. Ідэалогія беларускай дзяржавы заклікана ўмацоўваць

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

у народзе Беларусі стагоддзямі існуючы імунітэт супраць нацыянальнай абмежаванасці, пагарды да іншых народаў. Ідэалогія арыентавана на забеспячэнне інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у сусветнай супольнасці, але не праз адасобленасць і самаізаляцыю, а праз імкненне да шматвектарнага супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі свету.

Такім чынам, сучасная ідэалогія беларускай дзяржавы з'яўляецца своеасаблівай «духоўнай канстытуцыяй» краіны. Яна аб'ядноўвае грамадзян рознай этнічнай, моўнай і канфесійнай прыналежнасці і ўладныя структуры ў адзіны арганізм.

*Якую ролю адыгрывае ідэалогія беларускай дзяржавы на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства?*

Ва ўмовах развіцця Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы ўсё большае значэнне набывае пытанне афармлення агульнанацыянальнай ідэі. Беларуская агульнанацыянальная ідэя ў сучасных умовах — гэта ідэя ўзнаўлення і ўсебаковага развіцця беларускай нацыі, якая разумеецца як суверэнная супольнасць усіх грамадзян Рэспублікі Беларусь. Гэтая ідэя можа быць забяспечана ператварэннем Беларусі ў моцную і квітнеючую дзяржаву шляхам яе бесперапыннага інавацыйнага абнаўлення, уключэння ў інтэграцыйныя працэсы.

Паняцце «агульнанацыянальная ідэя» лічыцца больш шырокім па змесце, чым ідэя нацыянальная. Агульнанацыянальная ідэя здольная аб'яднаць большасць грамадзян рэспублікі, стаць асновай для кансалідацыі і стабілізацыі грамадства.

**Ядро агульнанацыянальнай ідэі Беларусі**

| | | |
|---|---|---|
| Канстытуцыйны парадак і законнасць | Сацыяльная справядлівасць | Духоўнае адраджэнне |
| Народаўладдзе | Патрыятызм | Нацыянальная годнасць |

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка на сустрэчы з прадстаўнікамі грамадскасці і экспертнай супольнасці, беларускіх і замежных СМІ «Вялікая размова з Прэзідэнтам» 1 сакавіка 2019 г. выказаў сваё меркаванне: «… нацыянальная ідэя павінна быць асаблівай. Яна павінна быць толькі тваёй і класціся на душу і сэрца. І, з майго пункта гледжання, мы сваю нацыянальную ідэю яшчэ не выпрацавалі. Можа, час не прыйшоў».

*Як бы вы сфармулявалі сутнасць беларускай нацыянальнай ідэі?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных канфесій.** У канцы XX ст. спачатку ў сувязі з працэсамі дэмакратызацыі ў Савецкім Саюзе, а затым з абвяшчэннем суверэнітэту Рэспублікі Беларусь адбылася пераацэнка ролі і месца рэлігіі і яе інстытутаў у жыцці беларускага грамадства. Былі створаны перадумовы для адраджэння хрысціянскіх каштоўнасцей і дзейнасці рэлігійных арганізацый. Гэтаму спрыялі змены ў канфесійнай палітыцы дзяржавы і прыняцце новага заканадаўства.

Рэспубліка Беларусь — шматканфесійная дзяржава. На 1 студзеня 2021 г. у нашай краіне зарэгістравана 25 рэлігійных канфесій і кірункаў. Агульная колькасць рэлігійных арганізацый у цяперашні час дасягнула 3569. У адпаведнасці са сваімі статутамі дзейнічаюць 174 рэлігійныя арганізацыі, якія маюць агульнаканфесійнае значэнне (рэлігійныя аб'яднанні, манастыры, місіі, брацтвы, сястрынствы, духоўныя навучальныя ўстановы). У рэспубліцы зарэгістравана 3315 рэлігійных суполак.



Свята-Духаў кафедральны сабор у Мінску

Беларуская праваслаўная царква аб'ядноўвае 1643 праваслаўныя парафіі, 15 епархій, 7 духоўных навучальных устаноў, 35 манастыроў, 15 брацтваў, 10 сястрынстваў. Дзейнічаюць 1535 праваслаўных храмаў, яшчэ 194 будуюцца.

Рыма-каталіцкая царква ў Рэспубліцы Беларусь аб'ядноўвае чатыры дыяцэзіі, якія налічваюць 491 суполку. Дзейнічаюць 5 духоўных навучальных устаноў, 11 місій і 9 манастыроў. Абшчыны валодаюць 488 касцёламі, 36 будуюцца.



Траецкі касцёл у в. Гервяты

Пратэстанцкія рэлігійныя арганізацыі прадстаўлены 1057 рэлігійнымі суполкамі, 21 аб'яднаннем, 22 місіямі

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Саборная мячэць у Мінску

і 5 духоўнымі навучальнымі ўстановамі 14 рэлігійных кірункаў.

У Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваны 33 рэлігійныя абшчыны стараэвераў, у распараджэнні вернікаў маецца 27 культавых будынкаў.

У трох іўдзейскіх рэлігійных аб'яднаннях налічваецца 52 рэлігійныя абшчыны, 10 з іх маюць аўтаномны статус, валодаюць 9 культавымі будынкамі.

Таксама ў рэспубліцы дзейнічаюць 25 мусульманскіх рэлігійных суполак, у тым ліку 24 суніцкага кірунку і 1 шыіцкага. Дзейнічаюць 7 культавых будынкаў і Саборная мячэць у г. Мінску.

Канфесійная палітыка дзяржавы накіравана на падтрыманне і ўмацаванне міжканфесійнага міру і згоды ў беларускім грамадстве, развіццё ўзаемадзеяння з гістарычна традыцыйнымі канфесіямі.

Дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь стварае прававое поле, у якім рэлігійныя арганізацыі могуць паўнавартасна дзейнічаць і развівацца, а грамадзянам гарантуюцца іх канстытуцыйныя правы на свабоду сумлення і веравызнання.

Такім чынам, для сучаснага беларускага грамадства характэрныя верацярпімасць, адкрытасць да дыялогу, адсутнасць канфліктаў і вострых супярэчнасцей на нацыянальнай і рэлігійнай аснове. Беларусь з'яўляецца тэрыторыяй міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру і згоды. Важную ролю ў забеспячэнні іх адыгрываюць як менталітэт беларусаў, так і палітыка дзяржавы ў галіне міжнацыянальных і міжканфесійных адносін, накіраваная на мірнае суіснаванне рэлігійных і этнічных супольнасцей у інтарэсах устойлівага развіцця краіны.

1. Дакажыце, што ў XX — пачатку XXI ст. беларуская нацыянальная ідэя атрымала сваё рэальнае ўвасабленне.
2. Якія гістарычныя ўмовы, на ваш погляд, абумовілі шматнацыянальны і шматканфесійны склад насельніцтва Беларусі? Сваё меркаванне аргументуйце.
3. Як, на вашу думку, суадносяцца паняцці «беларуская нацыянальная ідэя» і «ідэалогія беларускай дзяржавы»?
4. Ахарактарызуйце ідэалогію беларускай дзяржавы па наступным плане: прызначэнне; характэрныя рысы; асноўныя прыярытэты; роля ў сучасным беларускім грамадстве.
5. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы (мясцовыя СМІ, сайт райвыканкама і інш.), даведайцеся аб нацыянальным і канфесійным складзе на-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

сельніцтва рэгіёну, у якім вы жывяце. Якую ролю адыгрываюць рэлігійныя канфесіі ў грамадскім і культурным жыцці вашага рэгіёну?

# Абагульненне па раздзеле «Фарміраванне беларускай нацыі. Канфесійнае становішча ў Беларусі»

Наш край

Абагульненне па раздзеле IV

## Працуем з вучэбным тэкстам

На аснове тэксту вучэбнага дапаможніка складзіце тэзісны план адказу на пытанне «Гістарычныя дзеячы, якія паўплывалі на фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі, нацыянальнай дзяржаўнасці, нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа ў канцы XIX — пачатку XX ст.».

## Працуем з паняццямі

**1.** Дайце назву воблаку слоў, вызначыўшы, якому перыяду ў гісторыі Беларусі яно прысвечана. З пункта гледжання чалавека, які жыве ў гэты час, апішыце працэсы, што адбываюцца ў краіне, і выкажыце сваё стаўленне да іх.

**2.** Растлумачце значэнне паняцця «тутэйшасць». Чаму ў сучасным свеце паняцце малой радзімы істотна самаактуалізуецца?



## Сістэматызуем веды

Прапануйце сваю перыядызацыю фарміравання беларускай нацыі, паказаўшы часавыя рамкі, назвы этапаў, характэрныя рысы кожнага з іх. Адказ запішыце ў сшыткі.

Часавыя рамкі:

____________ ____________ ____________ ____________

Назвы этапаў:



Характэрныя рысы кожнага з іх:

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

## Аналізуем і разважаем

**1.** Для чаго кожнаму народу неабходная свая нацыянальная ідэя?

**2.** Якая нацыянальная ідэя аб'ядноўвала беларусаў у розныя перыяды нашай гісторыі?

**3.** Якія гістарычныя ўмовы ўплывалі на фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі ў розныя часы?

**4.** Вызначце прычыны і наступствы правядзення антырэлігійнай палітыкі ў БССР. Як яна адбілася на штодзённасці і светапоглядзе беларусаў; на захаванні духоўнай і гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі?

## Устанаўліваем прычынна-выніковыя сувязі

Растлумачце ўзаемасувязь паміж наступнымі гістарычнымі падзеямі і з'явамі:

а) канфесійная палітыка дзяржавы, грамадска-палітычныя і культурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі;


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

б) шматнацыянальны склад насельніцтва Беларусі і фарміраванне менталітэту беларусаў.

## Прыкладныя кірункі для даследчых і праектных работ

**1.** Менталітэт кожнага народа знаходзіць найбольш яркае адлюстраванне ў фальклоры. Знайдзіце і прааналізуйце беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, казкі, песні, у якіх раскрываецца стаўленне беларусаў да свету, да іншых людзей і саміх сябе. Прадстаўце атрыманы вамі вынік у любой зручнай і цікавай для вас форме (праект, паведамленне, эсэ, відэаролік, лэпбук і г. д.).

**2.** Прадстаўце ў выглядзе прэзентацыі або інфаграфікі сучасныя нацыянальны, сацыяльны і канфесійны партрэты Беларусі, узяўшы за аснову тэкст вучэбнага дапаможніка, дадзеныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь і правёўшы апытанне сярод пэўнай выбаркі людзей (сябры, аднакласнікі, іх бацькі). Параўнайце атрыманыя дадзеныя. Ацаніце ступень дакладнасці кожнай з крыніц інфармацыі, якія вы выкарыстоўваеце.

## Творчае заданне

*Сямейныя традыцыі*

Для ўрока па тэме «Наш край» збярыце апісанне бытавых, рэлігійных, працоўных, забаўляльных і іншых традыцый, звычаяў і абрадаў, якія існуюць у вашай сям'і. Складзіце да іх неабходныя каментарыі. Вызначце, якія традыцыі склаліся самі па сабе, а якія былі свядома прыўнесеныя ў сувязі з пэўнымі працэсамі ў развіцці нашай краіны. Растлумачце, як традыцыі і звычаі вашай сям'і звязаны з этнічнымі і канфесійнымі працэсамі, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі ў XIX–XX стст.

## Рэкамендуем наведаць музеі

**Мінск**: Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.
Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці.
Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту.
Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры.
Музей гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі.
**Гродна**: Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі.
**Пінск**: Музей Беларускага Палесся.
**Полацк**: Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я.
**Мазыр**: Музей народнай культуры Мазыршчыны «Палеская веда».
**Ветка**: Веткаўскі музей стараверства і беларускіх традыцый.
**Усе рэгіёны**: абласныя і раённыя краязнаўчыя музеі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ